Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Вашы сілы, уменні і здольнасці будуць у поўнай меры запатрабаваны. Але вы, здаецца, надта загразлі ў дробязях, каб гэта заўважыць. Разбірайцеся ў іх паступова, не варта практыкаваць нязменныя працоўныя вахты. Вас можа пацягнуць на подзвігі і авантуры, гэтыя парывы лепш стрымаць. Хатнія клопаты ў выхадныя толькі павысяць настрой.

ЦЯЛЕЦ. На гэтым тыдні давядзецца нешта мяняць. Або ў адносінах з блізкімі людзьмі, або з калегамі па рабоце. У сераду паспрабуйце не дапускаць агрэсіі і негатыву. У другой палове тыдня магчымы нечаканы паварот да лепшага ў партнёрскіх адносінах або судовых справах за кошт з'яўлення цалкам новай інфармацыі.

БЛІЗНЯТЫ. Напружаная работа ў пачатку тыдня можа вас стаміць, але фінансавыя перспектывы стануць больш зразумелыя і прыемныя, што акупіць усе перажыванні. У пятніцу многія праблемы знойдуць сваё рашэнне. Каханы чалавек парадуе, а любоў акрыліць.

РАК. Тыдзень можа аказацца вельмі спрыяльным, і нават мінімальныя намаганні здольныя будуць прынесці істотныя вынікі. Давядзецца здзяйсняць неардынарныя ўчынкі. У другой палове тыдня давядзецца разбірацца з праблемамі сяброў. І вы сапраўды зможаце дапамагчы. У пятніцу паразуменне з навакольнымі будзе ідэальнае.

ЛЕЎ. Тыдзень спрыяльны для новых спраў, пошуку партнёраў і аднадумцаў. Адзінае, што можа азмрочыць настрой, — гэта спазненні і непаразуменні, таму паспрабуйце разлічваць час, звязаны з паездкамі і перасоўваннямі, «з запасам». А ў размовах і публічных выступленнях непажадана злоўжываць жартамі. Закаханасць не заўсёды спрыяе засяроджанасці ў рабоце. Ваш дэвіз у выхадныя — «трымацца залатой сярэдзіны».

ДЗЕВА. Гэты тыдзень — удалы час для прымірэння з ворагамі і здабыцця новых сяброў. Шчырасць, дабрыня і шчодрасць прынясуць нечаканы поспех. У панядзелак і аўторак варта часова звузіць кола зносін — не марнуйце сілы на пустыя размовы. У чацвер вашы жаданні пачнуць выконвацца, калі яны не зусім фантастычныя. Дэвіз на пятніцу: «Спакой і толькі спакой» — што б ні здарылася, трымайце сябе ў руках.

ШАЛІ. Вам можна спадзявацца на поспех у прафесійнай сферы і ў бізнесе. Аб'ём работы на тыдзень не здзівіць і не спалохае. Могуць засмуціць толькі вынікі працы, але вы занадта крытычныя да сябе. Будзьце аб'ектыўныя. Аўторак — ўдалы дзень для рызыкі і прыняцця хуткіх рашэнняў. У сераду можаце адчуць напружанне ў калектыве. Лепш прамаўчаць, чым высвятляць адносіны.

СКАРПІЁН. Надыходзіць спрыяльны перыяд для рэалізацыі многіх пачынанняў. Будзьце энергічныя, актыўныя, вынаходлівыя. Раскрываючы свой творчы патэнцыял, вы добра заробіце. Справы пойдуць лёгка, трэба будзе толькі накіроўваць сваю энергію ў патрэбнае рэчышча, падтрымліваючы ўласны рух у патоку падзей. У гэты час вам лёгка будзе падняцца па службовай лесвіцы, разбагацець, зрабіць шчаслівым каханага чалавека.

СТРАЛЕЦ. Тыдзень падорыць новыя сілы для дасягнення пастаўленых мэт. Вас чакае значнае прасоўванне ў справах. У аўторак зможаце дасягнуць таго, пра што марылі, прычым на гэта не давядзецца затрачваць шмат намаганняў. У пятніцу паездкі і сустрэчы не прынясуць чаканых вынікаў, лепш прысвяціць гэты дзень звычайнай рабоце. У суботу пажадана не ўступаць у канфлікт з навакольнымі адкрыта. Лепш не спрачайцеся і згаджайцеся, але працягвайце спакойна рабіць усё па-свойму.

КАЗЯРОГ. Тыдзень можа парадаваць ажыццяўленнем даўняга праекта. Многае будзе залежаць ад вашай мэтанакіраванасці. Калі вы хочаце дасягнуць поспеху, то неабходна вызначыцца з прынцыпамі і дакладна высветліць, чаго вы хочаце і на якіх умовах. Серада — прыемны і напоўнены падзеямі дзень. Больш размаўляйце з людзьмі, кажыце ім камплімэнты. Калі ёсць просьбы да кіраўніцтва, можаце смела з імі звяртацца, бо вынік будзе станоўчы. У чацвер не забывайце пра сваю сям'ю. Пятніца — удалы дзень для канструктыўных прапаноў, аднак прыслухайцеся да парад калег.

ВАДАЛІЎ. На гэтым тыдні надыходзіць спрыяльны момант для абнаўлення ў многіх жыццёвых сферах. Не варта таптацца на месцы, трэба рухацца наперад. Аўторак можа падарыць радасць зносін з сябрамі і аднадумцамі. У чацвер і пятніцу ўдасца прадэманстраваць прафесіяналізм і сваю незаменнасць, што можа прынесці вам прыемную ўзнагароду.

РЫБЫ. Спадарыня Фартуна вырашыла ўсміхнуцца вам. Тыдзень, хутчэй за ўсё, акажацца менш напружаны, чым мінулы. З'явяцца і вольны час, і магчымасць крыху адпачыць і развеяцца. Глядзіце на жыццё рэальна. Паспрабуйце не прыніжаць самаацэнку. У чацвер надарыцца магчымасць новага заробку.

Даты | Падзеі | Людзі

18 СТУДЗЕНЯ

У краіне

1855 год — нарадзіўся (цяперашні Івацэвіцкі раён) Канстанцін Вікенцьевіч Хруцкі, герой руска-турэцкай вайны (1877—1878). У 1885 годзе скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю. У 1875—1881 гадах служыў у войску, старшы ўнтэр-афіцэр, удзельнік вызвалення Балгарыі ад турэцкага прыгнёту, у тым ліку штурму крэпасці Плеўна. Вызначыўся пры абароне перавалу на Шыпцы. З 1885 года — сельскі настаўнік у Гродзенскай губерні. З 1915-га — у Маскве, удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі. У 1919 годзе за рэвалюцыйную дзейнасць арыштаваны ў Омску калчакаўцамі і прыгавораны да расстрэлу. Пасля вызвалення Чырвонай Арміяй працаваў у Сібіры, у Новарасійску. Пражыў 113 гадоў.

1882 год — нарадзіся Іосіф Рыгоравіч Лангбард, архітэктар, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, доктар архітэктуры, прафесар. Адзін з заснавальнікаў савецкай архітэктуры Беларусі. Сярод работ у Мінску: Дом урада, Цэнтральны Дом афіцэраў, будынак Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, галоўны корпус НАН Беларусі. Адзін з аўтараў эскіза планіроўкі Мінска і схемы генплана пасляваеннага Гомеля.

1900 год — нарадзіўся (Мінск) Віктар Іванавіч Баркоўскі, мовазнаўца, акадэмік АН СССР (1972), доктар філалагічных навук (1950), прафесар (1930). У 1923-м скончыў Петраградскі ўніверсітэт. З 1950 года працаваў у Інстытуце мовазнаўства СССР (у 1954—1960 гадах — дырэктар), з 1960 года — у Інстытуце рускай мовы АН СССР. Даследаваў старажытнарускую пісьменнасць, гістарычную граматыку, сінтаксіс і дыялекталогію ўсходнеславянскіх моў, гісторыю айчыннага мовазнаўства. У 1930-я гады выступаў па пытаннях рэформы беларускага правапісу. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1970).

У свеце

1535 год — іспанскі канкістадор Франсіска Пісара заснаваў у Перу горад Ліма.

1825 год — у Маскве адкрыўся новы будынак Вялікага тэатра, пабудаваны Восіпам Бове на месцы згарэлага Вялікага Пятроўскага тэатра. Пасля пажару 1853 года гэты будынак быў значна перабудаваны, тады і з'явілася вядомая «Квадрыга» скульптара Пятра Клота.

1835 год — нарадзіўся Цэзар Антонавіч Кюі, рускі кампазітар, член «Магутнай кучкі», музычны крытык. Вядомы таксама як спецыяліст у галіне фартыфікацыі, інжынер-генерал, член трох інжынерных акадэмій. Напісаў каля 250 рамансаў і песень, вялікую колькасць мініяцюр для фартэпіяна і для скрыпкі, некалькі дзясяткаў хораў, шмат песень для дзяцей, інструментальныя і вакальныя ансамблі і іншыя творы.

1925 год — выйшаў першы нумар часопіса «Новый мир».

1950 год — нарадзіўся Барыс Георгіевіч Няўзораў, рускі акцёр тэатра і кіно, народны артыст Расійскай Федэрацыі (2011). Здымаўся ў фільмах «Людзі на балоце», «Расія маладая», «Каменская» і іншых.

1955 год — нарадзіўся Кевін Костнер, амерыканскі кінаакцёр.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.17	17.23	8.06
Віцебск —	9.13	17.06	7.53
Магілёў —	9.08	17.13	8.05
Гомель —	8.57	17.17	8.20
Гродна —	9.31	17.39	8.08
Брэст —	9.25	17.47	8.22

Месяц

Апошняя квадра 17 студзеня.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Іосіфа, Рыгора, Яўгеніі.*
К. *Пятра, Хрысціны.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Ну ты і тоўстая! — сказаў муж, гледзячы на муху. Але патэльню, якая ляцела ў галаву, было ўжо не спыніць.

Зрабіўшы разумны твар, маўчы, не выдавай сябе словамі!

— Салата ў сне — гэта да чаго? Добра ці дрэнна?

— Ну, гэта ўсяк лепш, чым наадварот...

Аб'ява: «Мяняю час, які ў мяне ёсць, на грошы, якіх у мяне няма. Работу не прапаноўваць».

Калі чорная кошка вырашыла перабегчы вам дарогу, у вас ёсць шанц даказаць ёй, што вы бегаеце хутчэй за яе.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 88.
Нумар падпісаны ў 19.30 17 студзеня 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12